Проблема взаимоотношений «отцов» и «детей» заключается в антогонистическом непонимании друг друга и нежелании принять ценности, отличные от собственных. В этом и заключается большой недостаток общества. Если конфликт «отцов» и «детей» обостряется, то это становится трагедией для двух поколений. Уроки русской классики полезны и сегодня для читателей всех возрастов, потому что поиск точек соприкосновения, понимание психологии собеседника – залог успешного преодоления конфликтных ситуаций и основа сближения разновозрастных поколений.

1. Гладкова, Г.А. Айчынная і сусветная літаратура: вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў неспецыяльных факультэтаў дзённай і завочнай форм навучання / Г.А. Гладкова. – Віцебск: УА "ВДУ імя П.М. Машэрава", 2008. – 88 с. URL: https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/2669/5/Гладкова.pdf (дата обращения: 09.09.2022).
2. Грибоедов, А.С. Горе от ума: комедия / А.С. Грибоедов. – М. – Дрофа, 2007. – 222, [2] с.
3. Навасельцава, Г.В. Жанр рамана ў літаратуразнаўстве і літаратуры : метадычныя рэкамендацыі / склад. Г.В. Навасельцава. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2021. – 44 с. URL: https://rep.vsu.by/bitstream/123456789/28192/1/Навасельцава_Метадычныя%20рэкамендацыі.pdf (дата обращения: 09.09.2022).
4. Тарасенко, Д.Н., Лекаца А.Н. Проблема «Отцов» и «Детей» в современном обществе /А.Н. Лекаца, Д.Н. Тарасенко // Международный журнал экспериментального образования. – 2015. – №11-6 – С 962–963.
5. Тургенев, И.С. Отцы и дети. / И.С. Тургенев. – М., 1968. – 222 с.

## ПАНЯЦЦЕ ВІРТУАЛЬНАЙ АСОБЫ Ў КАНТЭКСЦЕ СЕЦІЎНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

***Яблакаў М.А.,***
*студэнт ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – **Русілка В.І.,** канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы. Сеціўная літаратура, віртуальная асоба, інтэрнэт, міфатворчаць, постмадэрнізм.
Keywords. Network literature, virtual personality, Internet, myth-making, postmodernism.

Актуальнасць дадзенай навуковай працы заключаецца ў слабой даследаванасці паняцця "віртуальная асоба" у межах сеціўнай літаратуры. Многія даследчыкі аналізавалі адметнасці літаратурных жанраў у розныя часы. Напрыклад, А.У. Крыклівец глыбока даследавала гэтую тэму ў працы "Стылёвыя плыні ў рускай і беларускай мадэрнісцкай літаратуры другой паловы XX стагоддзя" [1]. У дадзенай навуковай працы мы будзем аналізаваць жанравую асаблівасць менавіта інтэрнэт-літаратуры Адзначым, што ў літаратуры аўтар праяўляецца не як рэальны творца, стваральнік тэксту, а як віртуальная асоба, ананімная фігура, якая надзелена ўмоўным іменем, комплексам знакаў і функцый. Аўтар у сеціратуры віртуальны і ананімны не фармальна, а па сутнасці. Віртуальнасць і гульнявы характар творчага асяроддзя стварае ўмовы для адвольнай сувязі паміж рэальнымі і сеціўнымі асобамі. Гаворка тут не ідзе пра фармальную адсутнасць імені (выпадковым або ўсвядомленым), – і ў такіх выпадках у традыцыйнай літаратуры прысутнічае ясна ўсвядомленая пазіцыя і вобраз рэфлектуючай асобы творцы. Сеціўны аўтар бесцялесны і віртуальны па сваім творчым абліччы.

**Матэрыялы і метады.** У якасці матэрыялаў для дадзенай навуковай працы былі выкарастаны публікацыі А.У. Крыклівец "Стылёвыя плыні ў рускай і беларускай мадэрнісцкай літаратуры другой паловы XX стагоддзя", Губайлоўскага В.А. "Век інфармацыі" і Горнага Я.А. "Анталогія віртуальнай асобы". У працы выкарыстаныя прыёмы тэарэтычнага і кампаратыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванні.** У адрозненне ад рэальнага аўтара, віртуальная асоба – «ёсць аб'ект, якому прыпісваюцца якасці суб'екта», і які «не мае матэрыяльнага цела і складаецца выключна са знакаў і дзеянняў (а таксама, падобна рэальнай асобе, з вобразаў, думак і пачуццяў, якія яна нараджае ў псіхіцы назіральнікаў)» [2].

На думку даследчыка сеціўнай літаратуры Яўгена Горнага, гэтыя якасці падобныя з міфатворчасцю: «Адсутнасць уласнага імя робіць немагчымым адрозненне аб'екта ад іншых аб'ектаў таго ж класа. Напрыклад, ананімныя запісы ў электроннай дыскусіі

ўспрымаюцца як безасабовыя, калі нават яны ўтрымліваюць арыгінальныя ідэі і валодаюць прыкметамі індывідуальнага стылю. З іншага боку, запісы, зробленыя шэрагам людзей, падпісаныя адным і тым жа іменем, ствараюць ўражанне, што яны адносяцца да той жа самай асобы. Падобным чынам, надзяленне іменем неадушаўлёнага прадмета, напрыклад, дрэва, кубка або часткі цела, надае яму якасці асобы. Сувязь гэтага факту з логікай міфа ў каментарыях не мае патрэбы» [3, с. 21].

Дзякуючы сціранню граняў паміж аўтарам і персанажам, на думку С. Корнева, «"Аўтар" у сетцы, як "віртуальная аўтарская асоба", сам па сабе ператвараецца ў асаблівы жанр літаратурнай творчасці» [3, с. 23].

Адзначым, такія віртуальныя асобы, перш за ўсё – персанажы, але не звычайныя, бо аўтары гэтых персанажаў праз іх атрымліваюць магчымасць свабодна, абыходзячы ўнутраную цэнзуру, выказаць свой унутраны свет, без усялякіх абмежаванняў рэалізаваць свае адчуванні і погляд на свет, стварыць свой вобраз і міф пра сябе, непасрэдна кантактаваць з аўдыторыяй. Такім чынам, віртуальная асоба ў інтэрнэце паўстае і як аўтаномны персанаж, і як спосаб пабудовы вобраза аўтара. «У працэсе стварэння ўяўных сусветаў або ўдзелу ў віртуальным свеце чалавек парадаксальным чынам дасягае самапазнання праз аб'ектывацыю свайго "я" (ці некаторых яго бакоў) ў персанажа, якога ён стварае або ў якога гуляе. Стварэнне віртуальнай асобы, такім чынам, аказваецца формай творчага акту і, адначасова з гэтым, шляхам да самапазнання» [2].

Многімі даследчыкамі адзначаецца, што ў апошнія гады віртуальная асоба інтэрнэту як форма літаратуры страціла сваю актуальнасць і захавалася толькі як тэхнічны прыём, які дазваляе захаваць ананімнасць суб'ектаў сеціўнай творчасці.

**Заключэнне.** Такім чынам, творчасць сеціўных пісьменнікаў як віртуальных суб'ектаў літаратурнага працэсу адрозніваецца ананімнасцю і калектыўнасцю (шматаўтарнасць), інтэрактыўнымі формамі зносін паміж стваральнікам і карыстальнікамі, непасрэднай прысутнасцю аўтара і чытачоў у сеціўным літаратурным працэсе, актывізацыяй карыстальнікаў як суб'ектаў літаратурнай сутворчасці, наяўнасцю элементаў гульні, дынамізмам, пастаянным нарастаннем і абнаўленнем тэкстаў.

1. Крикливец, Е. В. Стилевые течения в русской и белорусской модернистской литературе второй половины XX века (на примере жанра повести) / Е. В. Крикливец // Ученые записки УО «ВГУ имени П. М. Машерова». – 2018. – Т. 26. – С. 177–183. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/16664 Дата доступа: 05.09.2022

2. Горный, Е. А. [Электронный ресурс] / Е. А. Горный. Онтология виртуальной личности – Новосибирск, 2004. – Режим доступа: https://www.netslova.ru/gorny/selected/ovl.html. – Дата доступа 05.09.2022.

3. Губайловский, В. А. Век информации / В. А. Губайловский. // Новый мир № 8. – Москва, 1999. – С. 20–24.